**У. І. КУЛІКОВІЧ,**
кандыдат філалагічных навук,
дацэнт кафедры рэдакцыйна-выдавецкіх тэхналогій
Беларускага дзяржаўнага тэхналагічнага ўніверсітэта

# НОВЫЯ МАГЧЫМАСЦІ ДЛЯ ВЫВУЧЭННЯ БЕЛАРУСКАЙ АРФАГРАФІІ

## Уступ

Якасць вучэбнага працэсу ў сучасных установах агульнай сярэдняй адукацыі і ВНУ краіны залежыць ад многіх фактараў. Нагадаем асноўныя: 1) навукова-педагагічная кампетэнцыя настаўніка і выкладчыка, якая прадугледжвае а) выдатнае веданне свайго прадмета, б) арганізатарскія здольнасці, в) уменне ўкараняць найноўшыя інфармацыйныя тэхналогіі для эфектыўнага выкарыстання аўдыторнага і пазааўдыторнага часу для правядзення, падрыхтоўкі і аналізу ўрокаў, лекцыйных, практычных і семінарскіх заняткаў; 2) матывацыя навучэнцаў, іх жаданне вывучаць той ці іншы прадмет у строга вызначаным аб'ёме або імкнуцца да пашырэння навукова-практычнага кругагляду праз дадатковыя матэрыялы; 3) забяспечанасць вучэбнага працэсу навукова-метадычнай літаратурай, што адпавядае тэндэнцыям развіцця сучаснага грамадства і найноўшым дасягненням навуковай думкі.

Пры вывучэнні беларускай мовы сёння ў сувязі з уступленнем у дзеянне Закона Рэспублікі Беларусь «Аб Правілах беларускай арфаграфіі і пунктуацыі» (2008) [1] асаблівую актуальнасць набывае вывучэнне правапісу. І не толькі таму, што ў большасці носьбітаў мовы ён асацыіруецца з усёй мовай, але і таму, што ён мае шэраг асаблівасцей, якія ўплываюць на якасць падрыхтоўкі чалавека адукаванага. Сёння, каб засвоіць правілы арфаграфіі і пісаць граматна пабеларуску, неабходна ведаць: 1) класіфікацыю гукаў, фанетычныя законы і выключэнні з гэтых законаў, паколькі асобныя правілы арфаграфіі ўключаюць такія паняцці, як губныя, заднеязычныя, зацвярдзелыя гукі, асіміляцыйная мяккасць, і прадугледжваюць або не прадугледжваюць адлюстраванне на пісьме пазіцыйных / гістарычных чаргаванняў найменшых адзінак маўлення; 2) аб'ектыўныя і суб'ектыўныя законы арфаэпіі, бо менавіта вымаўленне абсалютызуецца асобнымі арфаграфічнымі законамі ў якасці аднаго з ключавых прынцыпаў пры выбары арфаграмы; 3) марфеміку і словаўтварэнне, асноўныя катэгорыі якіх выкарыстоўваюцца падчас вывучэння правапісу зычных і галосных у прыстаўках і суфіксах, складаных і складанаскарочаных слоў; 4) лексікалогію, а дакладней крытэрыі размежавання ўласнабеларускай, славянскай і неславянскай (даўно запазычанай і нядаўна запазычанай) лексікі. Такім чынам, вывучэнне беларускай арфаграфіі абапіраецца на веды з многіх раздзелаў мовы. З гэтага вынікае, што праз арфаграфію вучань (студэнт) засвойвае шматлікія лінгвістычныя катэгорыі, асноўная з якіх — слова, яго сэнс, які ўсведамляецца, запамінаецца падчас разгляду яго напісання.

*Мэта артыкула* — прадставіць тэарэтычныя і практычныя магчымасці электроннага вучэбнага дапаможніка «Сучасная беларуская арфаграфія».

*Задачы* — 1) акрэсліць чытацкі адрас электроннай кнігі; 2) ахарактарызаваць тэарэтычны і практычны змест даведніка; 3) пазнаёміць карыстальнікаў з магчымасцямі электроннага варыянта падручніка.



4 «Беларуская мова і літаратура», № 4, 2012 г.

## Асноўная частка

Электронны вучэбны дапаможнік «Сучасная беларуская арфаграфія», створаны на кафедры рэдакцыйна-выдавецкіх тэхналогій Беларускага дзяржаўнага тэхналагічнага ўніверсітэта (аўтар — У. І. Куліковіч), з'яўляецца першым у краіне поўным выданнем, прысвечаным апісанню сістэмы правіл сучаснай беларускай арфаграфіі з улікам змен і дапаўненняў, прадугледжаных Законам Рэспублікі Беларусь «Аб Правілах беларускай арфаграфіі і пунктуацыі» (2008), рэдактарскай практыкі апошняга дзесяцігоддзя, аўтарскага разумення асобных арфаграфічных заканамернасцей. Ён разлічаны на тое, каб 1) аптымізаваць працэс навучання ў школах і ВНУ краіны; 2) павысіць агульнакультурны ўзровень карыстальнікаў беларускай мовай; 3) зацікавіць і падахвоціць грамадства да вывучэння беларускай мовы; 4) паспрыяць падняццю прэстыжу роднай мовы ў Беларусі і за яе межамі; 5) зменшыць выдаткі на распрацоўку і стварэнне навукова-метадычнай літаратуры па арфаграфіі.

**Чытацкі адрас.** Прапанаванае электроннае выданне, якое мае і папяровы варыянт [2], адрасавана масаваму чытачу — усім людзям, ад акадэміка да рознарабочага. Непасрэдна для працы (вывучэнне, выкладанне, правільнае напісанне слоў, рэдагаванне) кніга будзе надзвычай карысная наступным групам карыстальнікаў:

*выкладчыкам філалагічных і нефілалагічных спецыяльнасцей ВНУ, метадыстам абласных інстытутаў развіцця адукацыі* краіны для падрыхтоўкі да лекцый, правядзення лабараторных, практычных семінарскіх заняткаў, ажыццяўлення хуткага і аб'ектыўнага кантролю ведаў студэнтаў, слухачоў курсаў павышэння кваліфікацыі;

*настаўнікам беларускай мовы і літаратуры* для падрыхтоўкі вучняў да а) цэнтралізаванага тэсціравання, паколькі раздзел «Заліковы тэст» складзены як з улікам існуючых варыянтаў тэстаў, так і перспектыўнага аўтарскага бачання магчымасцей тэставага кантролю на ўроках роднай мовы, б) творчых конкурсаў і алімпіяд па беларускай мове і літаратуры, паколькі заданні раздзела «Кантрольная работа» прадугледжваюць прымяненне ведаў па лексікалогіі, фанетыцы, арфаэпіі, графіцы, марфеміцы і словаўтварэнні, патрабуюць высокага агульнакультурнага ўзроўню карыстальніка;

*навуковым супрацоўнікам* — аўтарам беларускамоўных лексікаграфічных даведнікаў, навуковых публікацый — для захавання адзінага арфаграфічнага рэжыму ў перадачы на пісьме славянскіх і неславянскіх лексічных адзінак;

*журналістам і рэдакцыйна-выдавецкім супрацоўнікам* для пошуку адказу на пытанні «Як пісаць слова ці словазлучэнне, якіх няма ў лексікаграфічным даведніку?», «Як вымаўляць гукі і спалучэнні гукаў у лексеме?»;

*вучням старшых класаў, студэнтам ВНУ* для самастойнай падрыхтоўкі да экзаменаў, залікаў, стварэння навуковых беларускамоўных праектаў.

**Апрабацыя матэрыялу.** Тэарэтычны і практычны матэрыял, змешчаны ў дапаможніку, праходзіў апрабацыю на працягу дзесяці год (2001—2011):

1) на курсах павышэння кваліфікацыі настаўнікаў беларускай мовы і літаратуры ва ўсіх абласных інстытутах развіцця адукацыі і Акадэміі паслядыпломнай адукацыі;

2) на лекцыях, практычных занятках, творчых сустрэчах са студэнтамі і выкладчыкамі філалагічных факультэтаў БДУ, БДПУ імя Максіма Танка, БрДУ імя А. С. Пушкіна, ВДУ імя П. М. Машэрава, МДУ імя А. Куляшова, са студэнтамі і выкладчыкамі факультэта выдавецкай справы і паліграфіі БДТУ;

3) на курсах павышэння кваліфікацыі, практычных занятках, майстар-класах з супрацоўнікамі Белтэлерадыёкампаніі;

4) на 15 навуковых канферэнцыях;

5) на занятках з супрацоўнікамі БелАЗа, Рэспубліканскага цэнтра эпідэміялогіі і гігіены, работнікамі творчых прафесій (групы «Палац» і «Ў»);

6) на занятках са школьнікамі ўсіх абласцей краіны падчас падрыхтоўкі да заключнага этапу рэспубліканскай алімпіяды па беларускай мове і літаратуры.

**Структура і змест.** Электронны вучэбны дапаможнік уключае дзесяць раздзелаў, пабudаваных па наступнай схеме.

1. Назва раздзела. 2. Тэарэтычны матэрыял (правілы). 3. Пытанні (для абмеркавання прачытанага і арганізацыі дыскусіі). 4. Трэніровачныя заданні. 5. Кантрольная работа. 6. Заліковы тэст.

Першы раздзел «Арфаграфія як раздзел мовазнаўства» прысвечаны тэорыі арфаграфіі. Ён складаецца з трох параграфаў «Арфаграфія і правапіс», «Практычнае значэнне арфаграфіі», «Асноўныя тэрміны». Матэрыял раздзела можна выкарыстаць пры падрыхтоўцы ўводнай лекцыі да курса «Арфаграфія», для азнаямлення слухачоў (вучняў) з лінгвістычнай інтэрпрэтацыяй такіх тэрмінаў і паняццяў, як арфаграма, апорнае напісанне, арфаграфічная памылка, арфаграфічны прынцып, арфаграфічнае правіла, раздзел арфаграфіі, арфаграфічны аналіз.

Адметнасці другога і трэцяга раздзелаў «Правапіс галосных» і «Правапіс зычных» у наступным.

1. Пачынаюцца яны параграфамі, у якіх прыводзяцца агульныя заканамернасці перадачы на пісьме галосных і зычных гукаў. Гэта інфармацыя, як засведчыла практыка, з'яўляецца надзвычай запатрабаванай і карыснай, бо дазваляе: а) не «перагружаць» канкрэтныя правілы лішнімі спасылкамі і заўвагамі, б) усвядомлена засвойваць змест і механізм дзеяння правіл.

2. Праведзена нумарацыя правіл, у аснову якой пакладзена разуменне правіла як указання, якое рэгламентуе напісанне слова або групы слоў, у адносінах да якіх дзейнічае адна заканамернасць (прынцып напісання, паходжанне слова, фанетычная пазіцыя гука). Напрыклад, напісанне літары *а* замест *о* і напісанне літары *а* замест *э* намі пазіцыянуюцца як два правілы, а не асобныя пункты аднаго арфаграфічнага закона, як гэта прынята ў іншых вучэбных дапаможніках па арфаграфіі, дзе правілам лічыцца ўказанне нарматываў абагульненага характару, якое адносіцца да цэлага рада аднародных моўных фактаў. Тым самым мы імкнёмся акцэнтаваць увагу навучэнцаў на тым, што не заўсёды нават да адной катэгорыі слоў можна прымяніць адзін і той жа прынцып перадачы іх на пісьме тыпу «пішы, як чуеш».

3. Упершыню ў практыцы навучання беларускай арфаграфіі пасля асобных правіл падаецца спасылка «Цяжкасці прымянення правіла». У прыватнасці яна прысутнічае пасля правіл напісання літары *о*, перадачы на пісьме акання.

4. Упершыню зроблена спроба сфармуляваць агульныя правілы напісання ўстаўных і беглых галосных.

Чацвёрты раздзел мае назву «Правапіс мяккага знака і апострафа», пяты — «Ужыванне і правапіс марфем», шосты — «Правілы пераносу», сёмы — «Правапіс скарачэнняў», восьмы — «Ужыванне вялікай і малой літары», дзявяты — «Напісанне разам, праз злучок, асобна», дзясяты — «Ужыванне і напісанне часціц (прыставак) *не, ні*».

Пасля кожнага тэматычнага раздзела ўвазе карыстальнікаў прапануецца разнастайны практычны матэрыял, падзелены на тры групы: «Трэніровачныя заданні» — для працы ў аўдыторыі з мэтай назірання за дзеяннем кожнага правіла, набыцця навыкаў прымянення арфаграфічных законаў, «Кантрольная работа» і «Заліковы тэст» — для арганізацыі самастойнай кантралюемай работы студэнта (школьніка), хуткай праверкі ведаў па канкрэтнай тэме, пройдзенай самастойна або разам з выкладчыкам. Вялікая колькасць агульнаўжывальных слоў, а таксама лексічных адзінак з розных галін навукі і тэхнікі, прадстаўленых у заданнях, дазваляе а) павысіць агульнакультурны ўзровень навучэнца; б) якасна падрыхтавацца да цэнтралізаванага тэсціравання.

Сярод відаў заданняў прадстаўлены наступныя: 1) вызначыць і запісаць слова (у кантэксце і без яго) па прыведзеным значэнні з улікам пэўнай тэмы; 2) запісаць рускія словы (складаныя па структуры, уласныя імёны і г. д.) па-беларуску; 3) уставіць прапушчаныя літары; 4) уставіць прапушчаныя літары і выбраць лішняе слова; 5) утварыць розныя тыпы складаных слоў на аснове дадзенага словазлучэння; 6) выпісаць словы, у якіх дапушчаны арфаграфічныя памылкі, запісаўшы іх правільна; 7) уставіць прапушчаныя літары і вылучыць націскныя склады.

**Парады карыстальніку.** Для таго каб выкарыстаць тэарэтычны і практычны матэрыял электроннага падручніка, неабходна мець камп'ютар (мабільны тэлефон, іншае прыстасаванне) з правам доступу ў сетку інтэрнэт і ажыццявіць шэраг нескладаных аперацый.

1. Набраць **vedy.by** або адкрыць адну з найбольш прыдатных і зручных для вас праграм пошуку інфармацыі (Google.com, yandex.by, tut.by, rambler.ru) і ў ёй набраць **vedy.by**.

2. Увайсці і зарэгістравацца ў электроннай сістэме (кнопка «Рэгістрацыя» — Відарыс 1), пасля чаго зноў вярнуцца на галоўную старонку і націснуць кнопку «Уваход», каб зайсці ў сістэму («асабісты кабінет»).

*Відарыс 1.*




*Відарыс 2.*



*Відарыс 3.*




| Дата | Адзнака | Час | Вынікі |
|---|---|---|---|
| 11.10.2011 | 38% | 05 : 54 | Праглядзець |
| 12.10.2011 | 5% | 25 : 27 | Праглядзець |
| 04.11.2011 | 3% | 02 : 30 | Праглядзець |
| 08.11.2011 | 75% | 37 : 36 | Праглядзець |
| 08.11.2011 | 78% | 37 : 21 | Праглядзець |
| 08.11.2011 | 88% | 13 : 54 | Праглядзець |

*Відарыс 4.*




3. Менавіта з «асабістага кабінета» (Відарыс 2) у вас з'яўляецца магчымасць працаваць з матэрыялам электроннага дапаможніка, у якім прадстаўлены шырокі дыяпазон карысных функцый:

1) прагляд статыстыкі найбольш частых памылак аднаго карыстальніка і рэкамендацыі сістэмы па іх выпраўленні, а таксама і ацэнкі выкананых заданняў па канкрэтнай тэме і па ўсім курсе (блок «Статыстыка» — Відарыс 3);

2) хуткі пошук адпаведнага правіла (кнопка «Змест» — Відарыс 4) і, як працяг, выбар патрэбнага віду работы: а) азнаямленне з правілам; б) выкананне трэніровачных заданняў, кантрольнай работы або залiковага тэста па выбранай тэме (Відарыс 5);

3) статыстыка памылак усіх карыстальнікаў, што дазволіць устанавіць найбольш складаныя правілы і падчас навучання звяртаць больш увагі на іх змест, практычнае прымяненне (блок «Заўвагі»);

4) выкананне тэста па беларускай мове, складзенага ў адпаведнасці з патрабаваннямі да цэнтралізаванага тэсціравання за курс агульнаадукацыйнай школы (кнопка «Тэст»).

*Відарыс 5.*




## Вывады

Прапанаваная сістэма навучання арфаграфіі толькі пачынае сваё жыццё. Яна адкрывае шырокія магчымасці для рэалізацыі творчага патэнцыялу настаўніка і вучня, спрыяе павышэнню якасці навучання, эканоміі працоўнага часу выкладчыка, дазваляе арганізаваць вучобу і кантроль ведаў на адлегласці. Закладзены ў ёй запраграмаваны апарат робіць хуткім пошук патрэбнага правіла, задання, адказу на ўзніклае пытанне, спрашчае выбарачнае чытанне тэксту, забяспечвае праверку выкананых заданняў. Кніга не патрабуе паперы і тым самым спрыяе эканоміі рэсурсаў, можа дапаўняцца новымі словамі, заданнямі, практыкаваннямі, тэстамі, навукова-метадычнымі каментарамі і інш.

У адрозненне ад існуючых тэматычна блізкіх папяровых і электронных выданняў, дзе, як правіла, «не ставілася задача ахапіць усю разнастайнасць правапісу» [3, с. 3], электронная кніга па арфаграфіі як частка запланаванага комплекснага вучэбнага дапаможніка па беларускай мове стала першым у Беларусі даведнікам, у якім: 1) шырока прадстаўлены матэрыял, прысвечаны тэорыі беларускай арфаграфіі; 2) асвятляюцца складаныя пытанні правапісу (варыянтныя і спрэчныя арфаграмы); 3) прапанавана скразная нумарацыя правіл і вялікая колькасць слоў-прыкладаў з розных галін навукі, культуры, вытворчасці; 4) удакладнены змест асобных арфаграфічных прадпісанняў, змешчаных у Законе, з улікам іх спрашчэння і нагляднасці.

### Спіс літаратуры


1. Правілы беларускай арфаграфіі і пунктуацыі. — Мінск : Нац. цэнтр прававой інфармацыі Рэсп. Беларусь, 2008. — 144 с.

2. *Куліковіч, У. І.* Сучасная беларуская арфаграфія. Правілы. Трэніровачныя заданні. Кантрольныя работы. Заліковыя тэсты. Даведкі : вучэб. дапам. / У. І. Куліковіч. — Мінск : Новое знание, 2011. — 507 с.

3. Пішам па-беларуску: даведнік па арфаграфіі і пунктуацыі з каментарыямі : дапам. для агульнаадукац. устаноў з беларус. і рус. мовамі навучання / З. І. Бадзевіч [і інш.]. — Мінск : Аверсэв, 2010. — 192 с.